ПАДЗЕЯ

# АСТРАВЕЦ: СЯБРОЎСКАЯ ЦЕПЛЫНЯ ПРЫГАЖОСЦІ

**АСТРАВЕЦ. Яркай падзеяй культурнага жыцця Гродзеншчыны стала прэзентацыя калектыўнага зборніка паэзіі і прозы «Нам – семнадцать» (укладальнік член Саюза пісьменнікаў Беларусі і Саюза пісьменнікаў Расіі, паэт Аляксандр Марозаў). У праграме літаратурна-музычнага мерапрыемства прынялі ўдзел аўтары з розных куткоў рэспублікі, у тым ліку дэлегацыя Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ.**




17 кастрычніка ў зале Астравецкай раённай бібліятэкі сабраліся сапраўдныя аматары прыгажосці, прадстаўнікі розных пакаленняў, члены Астравецкага раённага літаратурнага аб'яднання, прадстаўнікі ўлады, культурная грамадскасць беларускай сталіцы атамшчыкаў, як сёння называюць Астравец. У раённым цэнтры ў гэты дзень праходзіла мноства мерапрыемстваў, прысвечаных Тыдню бацькоўскай любові. Нагодай сустрэчы ў бібліятэцы стаў выхад новай кнігі «Нам – семнадцать» (да 17-годдзя раённага літаб'яднання «Астравецкай зямлі галасы»). Пад вокладкай сабраны творы сучасных літаратараў Астравецкага раёна, а таксама паэзія і проза гасцей – аўтараў з Гродна, Гомеля, Мінска, з Расійскай Федэрацыі. Ініцыятарам праекта выступіў кіраўнік Астравецкага раённага літаратурнага аб'яднання, наш калега, паэт Аляксандр Марозаў. Справу выдання новай кнігі падтрымалі: кіраўніцтва Астравецкага раёна (старшыня райвыканкама Мядзвецкас Сяргей Тадэвушавіч); Астравецкі раённы Савет дэпутатаў (старшыня Бычко Генадзь Паўлавіч); Камунальнае сельскагаспадарчае ўнітарнае прадпрыемства «Гудагай» (дырэктар Садоўскі Эдуард Іванавіч). З падзякай Аляксандру Марозаву і вітаннем удзельнікаў творчай вечарыны выступіла намеснік старшыні Астравецкага райвыканкама Вольга Віктараўна Баяровіч.



А. І. Марозаў і В. В. Баяровіч

Гродзенскую літаратурную дэлегацыю склалі пераможцы абласных і рэспубліканскіх літаратурных конкурсаў, паэтэса Юлія Мельнік; паэт, аўтар і выканаўца песень Андрэй Татур; паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык. У праграме мерапрыемства прыняў удзел паэт, бард Сяргей Старыкаў (Гомель).

Аляксандр Іванавіч Марозаў пазнаёміў прысутных з ідэяй стварэння зборніка, пералічыў яго асаблівасці і ўручыў аўтарскія экзэмпляры ўдзельнікам праекта. З прывітальным словам ад літаратараў Гродзенскай вобласці да астраўчан звярнуўся член СПБ Дзмітрый Радзівончык. Госць з абласнога цэнтра выказаў удзячнасць Аляксандру Марозаву за яго актыўную пазіцыю творцы і грамадзяніна. У межах мерапрыемства таксама адбылася прэзентацыя выдадзеных Гродзенскім абласным аддзяленнем СПБ калектыўных зборнікаў: «Песнярам Айчыны», «Памяти вечный огонь», «Поле памяти» і «Память огненных лет». На старонках апошняга надрукаваны і вершы аўтараў з Астравецкага краю – паэтэс Таісіі Сямёнавай, Людмілы Кухарэвіч і Капіталіны Пятроўскай. Затым у выкананні аўтараў гучалі вершы і песні. Дзею суправаджалі шчырыя, гучныя апладысменты. Вельмі важна, што прэзентацыю наведала моладзь – старшакласнікі адной са школ райцэнтра.



Адбыўся сапраўдны феерычны марафон мастацтва, які ў непагодлівы восеньскі дзень сагрэў людзей цеплынёй шчырага слова, лірызмам песеннага акорда, узнёслым пачуццём любові да бліжняга, да прыгажосці. …Кандыдат у шэрагі СПБ, пераможца Абласнога літаратурнага конкурсу імя Максіма Багдановіча ў намінацыі «Адкрыццё года», паэтэса Юлія Мельнік пабудавала сваё выступленне з твораў грамадзянскай і рамантычнай лірыкі, агучыла кранальнае прысвячэнне роднаму Палессю. Лаўрэат Абласнога конкурсу рукапісаў імя Цёткі (Алаізы Пашкевіч) і Абласнога літаратурнага конкурсу імя Максіма Багдановіча, паэт, аўтар і выканаўца песень Андрэй Татур прадэкламаваў вершы пра вайну і Вялікую Перамогу, а пасля літаральна расчуліў аўдыторыю сваімі пранікнёнымі баладамі пад гітарны акампанемент. Дзмітрый Радзівончык агучыў нарыс пра свайго дзеда, ветэрана Вялікай Айчыннай, а таксама прачытаў верш Людмілы Кебіч з кнігі «Нам – семнадцать». Госці і ўдзельнікі мерапрыемства ўшанавалі памяць герояў вайны і ахвяр фашызму хвілінай маўчання. З боку гаспадароў у праграме літаратурнага вечара выступілі паэтэсы: Вольга Сакові, Людміла Кухарэвіч, Святлана Бацюлева, Святлана Еўтушэнка, Ванда Радзевіч, Капіталіна Пятроўская, Тэрэса і Вікторыя Варановіч. Да выступоўцаў далучылася член СПБ, двухразовая пераможца Абласнога конкурсу рукапісаў імя Цёткі (Алаізы Пашкевіч), празаік, публіцыст, драматург Ніна Рыбік. Сваім віртуозным майстэрствам вечарыну ўпрыгожыў аўтар і выканаўца песень, бард з Гомеля Сяргей Старыкаў. З уласнай паэмай «Сад з розамі» выступіла юная пісьменніца, старшакласніца Астравецкай СШ № 3 Яна Мінкевіч. Удзельнікі імпрэзы пачулі шмат цёплых слоў ад старшыні Раённага Савета ветэранаў Ірыны Шляхтун. У галоўнай бібліятэцы і навучальных установах раёна засталіся прывезеныя гасцямі кнігі.




Выступленні кожнага ўдзельніка былі напоўнены любоўю да сваёй Радзімы і трапяткой павагай да нашага мінулага, да памяці пра яго. Менавіта гэтая непарушная сувязь пакаленняў, апетая ў нашых творах і кнігах, увасобленая ў праграме прэзентацыі, ёсць адпраўная кропка для руху наперад. А наперадзе чакаюць новыя цікавыя падзеі і новыя сустрэчы аднадумцаў, людзей, родных не па крыві, а па духу. Кастрычніцкая творчая вечарына ў Астраўцы адышла ў гісторыю, але ў сэрцах засталася яе душэўная цеплыня.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** незабыўныя моманты прэзентацыі калектыўнага зборніка паэзіі і прозы «Нам – семнадцать» з удзелам аўтараў з розных куткоў Беларусі. Астравецкая раённая бібліятэка. 17 кастрычніка 2025 года.




**Аляксандр Марозаў. Прэзентацыя зборніка «Нам – семнадцать»**




**Дзмітрый Радзівончык. Прэзентацыя калектыўных зборнікаў да 80-годдзя Вялікай Перамогі**







**Юлія Мельнік**






**Андрэй Татур**






**Сяргей Старыкаў (Гомель)**




Дзмітрый Радзівончык
выступіў з нарысам






Дзмітрый Радзівончык і намеснік дырэктара Астравецкай раённай бібліятэкі Юлія Віктараўна Граблеўская








Ніна Рыбік



Старшыня Савета ветэранаў Астравеччыны Ірына Шляхтун



Паэтэса Людміла Кухарэвіч прадэкламавала вершы і выканала песню





Працягнулі праграму члены раённага літаб'яднання «Астравецкай зямлі галасы»: Святлана Еўтушэнка



Святлана Бацюлева



Вольга Саковіч




Ванда Радзевіч




Капіталіна Пятроўская



Кіраўнік літаб'яднання Аляксандр Марозаў





Мастачкі, паэтэсы Вікторыя і Тэрэса Вcase




Юная паэтэса Яна Мінкевіч, 7 клас СШ № 3 г. Астраўца




**Аляксандр Марозаў і Юлія Мельнік**



**Пасля мерапрыемства – традыцыйная аўтографсесія**









**Астравецкая раённая бібліятэка. Этнічныя матывы**


ПОЖАР


ПОЖАР


ПОЖАР


АСТРАВЕЦ